## *Лешак Калакоўскі: вехі жыцьця і творчасьці*

23 кастрычніка 1927 г. — дзень народзінаў Лешака Калакоўскага, чальца Міжнароднага Інстытуту філязофіі Брытанскай Акадэміі, ганаровага чальца Амэрыканскай акадэміі Мастацтваў і Навук, сябры Баварскай акадэміі Мастацтваў. Сын Ежага Калакоўскага, публіцыста, дзеяча асьветы і каапэрацыі (загінуў у 1943 г.) і Люцыяны Петрусевіч, настаўніцы. Нарадзіўся ён у Радамі, дзе і правёў амаль усе свае школьныя гады. Але ў сувязі зь пераездам бацькоў школу давялося канчаць у Лодзі. Якраз з гэтага гораду ён і быў выселены разам з усёй сям’ёй нямецкімі акупацыйнымі ўладамі.

1945 г. — Лешак Калакоўскі вяртаецца ў Лодзь пасьля вызваленьня Польшчы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і экстэрнам здае экзамэны на атэстат сталасьці. У гэтым жа годзе ён пачынае навучаньне філязофіі ўва ўнівэрсытэце Лодзі.

1947 г. — апублікаваў першы артыкул пад назвай «Дыялектычныя імпрэсіі».

1947–1949 гг. — працуе ў якасьці асыстэнта на катадры лёгікі ўнівэрсытэту Лодзі.

1948 г. — друкуе артыкулы і рэцэнзіі.

1949 г. — ажаніўся з Тамарай Дымэнсон, пазьней — дакторкай-псыхіятаркай.

1949 г. — пераводзіцца ў Варшаўскі ўнівэрсытэт.

1950 г. — у Варшаўскім унівэрсытэце атрымлівае навуковую ступень магістра.

1950–1953 гг. — працуе ў Варшаўскім унівэрсытэце на катадры філязофіі ў якасьці асыстэнта.

1953 г. — абараніў у Варшаўскім унівэрсытэце кандыдацкую дысэртацыю пад назвай «Сьпіноза як гістарычная зьява сваёй эпохі».

1953–1955 гг. — адначасова супрацоўнічае з Інстытутам грамадзкіх навук.

1953 г. — атрымлівае пасаду ад’юнкта на катадры філязофіі Варшаўскага ўнівэрсытэту.

1955 г. — робіцца супрацоўнікам Інстытуту філязофіі і сацыялёгіі Польскай Акадэміі навук.

1956–1968 гг. — загадвае катадрай гісторыі філязофіі Новага часу Варшаўскага ўнівэрсытэту. Паралельна з гэтым працуе ў рэдакцыях аддзелаў філязофіі буйных польскіх навуковых выдавецтваў.

1956 г. — стаецца дацэнтам катадры філязофіі Варшаўскага ўнівэрсытэту.

1957 г. — дэбютаваў як празаік творам «Ключ нябесны, або Аповеды, пабудаваныя на сьвятой гісторыі і для навучаньня і перасьцярогі прызначаныя».

1957 г. — на працягу году перабывае ў Францыі і Галяндыі, дзе праводзіць дасьледаваньні рэлігійнай думкі XVII ст.

1964 г. — Лешаку Калакоўскаму прысуджаецца годнасьць экстраардынарнага прафэсара.

1966 г. — выключаны з партыі пасьля прачытаньня ў Варшаўскім унівэрсытэце спавешчаньня «Польская культура ў апошняе дзесяцігодзьдзе».

1968 г. — пазбаўленьне пасады прафэсара Варшаўскага ўнівэрсытэту.

лістапад 1968 г. — выезд у Канаду на запрашэньне ўнівэрсытэту *McGill* у Манрэалі.

1969 г. — атрымлівае катадру філязофіі Каліфарнійскага ўнівэрсытэту ў Бэрклі.

1970 г. — пастаянна працуе ў Оксфардзе, дзе выкладае ў *«All Souls College»*.

1975 г. — выкладае ў Ельскім унівэрсытэце (Нью-Хавэн).

1981–1982 г. — працуе ў Інстытуце грамадзкай думкі ў Чыкага.

У цяперашнім часе жыве ў Оксфардзе (Англія).